МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і
інтэрнацыяналізацыі адукацыі
________________ В.П. Кочын

17 студзеня 2025 г.
Рэгістрацыйны № 323-ВМ

# Праграма ўступных выпрабаванняў
# пры паступленні для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі

Спецыяльнасць 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова
гісторыка-культурнай спадчыны

Мінск, 2025 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**Гужалоўскі А.А.**, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ, доктар гістарычных навук, прафесар;

**Міхайлец М.А.**, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**Філіпчык Д.У.**, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычных навук

**РАЗГЛЕДЖАНА І РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
Пратакол ад 16.12.2024 № 5

Загадчык кафедры ____________ А.Н. Латушкін

Саветам гістарычнага факультэта
Пратакол ад 20.12.2024 № 4

Старшыня Савета ____________ А. Г. Каханоўскі

Адказны за рэдакцыю ____________ Д.У. Філіпчык

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступнага іспыту па спецыяльнасці 7-06-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і метадычныя рэкамендацыі складзеныя з улікам патрабаванняў да ўступных выпрабаванняў, устаноўленых Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Мэта ўступнага выпрабавання –** выявіць узровень сфарміраваных у абітурыентаў кампетэнцый, неабходных для паспяховага аваладання адукацыйнай праграмы паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.

**Задачы ўступнага выпрабавання:**

– прааналізаваць веды абітурыента ў галіне гісторыі, тэорыі і практыкі аховы культурнай спадчыны; уяўленні аб музеі як сацыякультурным інстытуце, яго гісторыі, сацыяльных функцыях, тыпалогіі, сучасным музейным будаўніцтве;

– выявіць наяўнасць матывацыі на дзейнасць па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– прааналізаваць здольнасці абітурыента ў галіне выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны музейнымі сродкамі;

– выявіць здольнасці да навуковага аналізу найбольш значных тэарэтычных канцэпцый.

**Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі паступаючых**

Для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі па УВА прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю.

Узровень асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі – вышэйшая адукацыя, агульная ці спецыяльная вышэйшая адукацыя.

Праграма ўступнага выпрабавання накіравана на пацверджанне наяўнасці неабходных для паспяховага асваення адукацыйнай праграмы паглубленай вышэйшай адукацыі наступных кампетэнцый:

***універсальныя***:

— УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыцяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі.

— УК-2. Вырашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове прымянення інфармаыйна-ккамунікацыйных тэхналогій.

— УК-3 Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння.

— УК-4 Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесіцныя, культурныя і іншыя аднозненні.

— УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці.

— УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці.

— УК-7. Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму.

— УК-8. Валодаць сучаснай культурай мыслення, выкарыстоўваць асновы філасофскіх ведаў у прафесійнай дзейнасці.
— УК-9. Аналізаваць і ацэньваць сацыяльна значыя з’явы, падзеі, працэсы, праяўляць прадпрымальніцкую ініцыятыву і рэалізоўваць навуковыя, сацыяльныя інавацыі.
— УК-10. Планаваць, арганізоўваць і весці менеджарскую, маркетынгавую і фінансавую дзейнасці у музеях і установах культуры.
— УК-11. Валодаць дзяржаўнымі мовамі для ажыцяўлення прафесійнай камунікацыі, падрыхтоўкі навуковых тэкстаў.
— УК-12. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей.
— УК-13. Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

***базавыя прафесійныя:***:

— БПК-1 Валодаць класічнай мовай на ўзроўні, дастатковым для разуменя іі інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц.
— БПК-2. Прымяняць тэарэтычныя і метадалагічныя асновы гістарычна-культурных і музеялагічных ведаў у дзенасці сучаснага музея і даследаваннях арехалагічных аб’ектаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.
— БПК-3. Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарынчыя падзеі і працэсы, адсягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны.
—БПК-4. Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцяў, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыяльна-культурную сітуацыю.
— БПК-5. Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, вылучаць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгёнаў.
— БПК-6. Вылучаць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны, комплекс яе характарыстык.
— БПК-7. Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.
—БПК-8. Прымяняць асноўныя метады абароны вытворчага персаналу і насельніцтва ад негатыўных уздзеянняў фактараў антрапагеннага, тэхнагеннага, прыроднага паходжання, прынцыпы рацыянальнага прыродакарыстання і энергазберажэння, забяспечваць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

Змест праграмы носіць комплексны і міждысцыплінарны характар і арыентаваны на выяўленне ў абітурыентаў агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў і ўменняў.

Паступаючы ў магістратуру па спецыяльнасці 7-06-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» павінен:

**ведаць:**

– найбольш актуальныя даследчыя праблемы, шырокі спектр відаў і формаў асветніцкай працы, сістэму мерапрыемстваў па забеспячэнню захаванасці

помнікаў, найноўшыя дасягненні ў галіне музейнага будаўніцтва, а таксама сістэму аховы помнікаў;
– нацыянальнае і асновы міжнароднага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

**умець:**

– вырашаць навукова-даследчыя, культурна-асветніцкія і арганізацыйна-кіраўніцкія задачы, звязаныя з выяўленнем, засваеннем і выкарыстаннем помнікаў культуры;
– вызначыць сучасныя пагрозы гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі і распрацоўваць прапановы па яе ахове;
– вырашаць практычныя задачы па забяспячэнні аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

**валодаць:**

– навуковай метадалогіяй, асноўнымі падыходамі і прынцыпамі ў вывучэнні і выкарыстанні гістарычнай, музеязнаўчай літаратуры;
– методыкай выяўлення аб’ектаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны і прадстаўлення іх на атрыманне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;
– сістэмай практычных навыкаў, неабходных у музейнай дзейнасці.

## Апісанне формы і працэдуры ўступнага выпрабавання

Уступнае выпрабаванне з'яўляецца працэдурай конкурснага адбору і умовай прыёму на навучанне для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі.

Арганізацыя правядзення конкурсу і прыёму асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі здзяйсняе прыёмная камісія ў адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ўстановы вышэйшай адукацыі і Правіламі прыёму асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі, зацвярджанымі Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2022 № 574.

Конкурсы на атрыманне паглыбленай вышэйшай адукацыі ў вочнай і завочнай формах атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове праводзяцца асобна. Уступныя выпрабаванні праводзяцца па зацверджаным старшынёй прыёмнай камісіі БДУ раскладзе.

Правядзенне ўступнага выпрабаванні ажыццяўляецца ў форме вуснага адказу, на рускай або беларускай мове.

Склад экзаменацыйнай камісіі зацвярджаецца загадам рэктара БДУ.

Пры правядзенні ўступнага іспыту ў вуснай форме час падрыхтоўкі абітурыента да адказу не менш за 30 хвілін і не павінен перавышаць 90 хвілін, а працягласць адказу не больш за 15 хвілін. Для ўдакладнення экзаменацыйнай ацэнкі абітурыенту могуць быць зададзены дадатковыя пытанні ў адпаведнасці з праграмай ўступнага выпрабавання.

Ацэнка ведаў асоб, якія паступаюць у магістратуру ажыццяўляецца па дзесяцібальнай шкале, станоўчай лічыцца адзнака не ніжэй «шасці».

Пры правядзенні ўступнага іспыту ў вуснай форме экзаменацыйная адзнака аб'яўляецца адразу пасля завяршэння апытання абітурыента.

**Характарыстыка структуры экзаменацыйнага білета**

Экзаменацыйны білет складаецца з трох тэарэтычных пытанняў па вучэбнай дысцыпліне «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», якая дазваляе ацаніць атрыманыя ў працэсе навучання на I ступені вышэйшай адукацыі (адукацыйная праграма бакалаўрыяту) веды.

**Крытэрыі ацэньвання адказу на ўступным выпрабаванні**

Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці ажыццяўляецца ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў па дзесяцібальнай шкале.

**10 (дзесяць) балаў:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту, а таксама па пытаннях, якія выходзяць за іх межы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета; бездакорнае валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні прафесійных задач; выразная здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне, па якой праводзіцца ўступны іспыт; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках, даваць ім крытычную ацэнку; выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых навук.

**9 (дзевяць) балаў:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычна граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета; валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах праграмы ўступнага іспыту; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту; уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім аналітычную ацэнку.

**8 (восем) балаў:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета; валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах праграмы ўступнага іспыту; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім аналітычную ацэнку.

**7 (сем) балаў:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім аналітычную ацэнку.

**6 (шэсць) балаў:**

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме праграмы ўступнага іспыту; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валоданне інструментарыем, уменнем яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыповыя рашэнні ў рамках праграмы ўступнага іспыту; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім параўнальную ацэнку.

**5 (пяць) балаў:**

дастатковыя веды ў аб'ёме праграмы ўступнага іспыту; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыповыя рашэнні ў рамках праграмы ўступнага іспыту; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках і даваць ім параўнальную ацэнку.

**4 (чатыры) балы:**

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін, уменнем яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім ацэнку.

**3 (тры) балы:**

недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказаў на пытанні білета з істотнымі лагічнымі памылкамі; слабое валоданне інструментарыем навучальных дысцыплін; некампетэнтнасць ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках.

**2 (два) балы:**

фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных праграмай ўступнага іспыту; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію, наяўнасць у адказе грубых лагічных памылак.

**1 (адзін) бал:**

адсутнасць ведаў і кампетэнцый ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; адмова ад адказу; няяўка на ўступны іспыт без паважнай прычыны.

# ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

## РАЗДЗЕЛ 1. ГІСТОРЫЯ, ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

### Тэма 1.1. Гісторыя музейнай справы

**Перыяд дамузейнага збіральніцтва.** Збіральніцтва прадметаў музейнага значэння ў Старажытным свеце. Зборы эканамічнага значэння. Зборы сацыяльнага прэстыжу. Магічныя і іншыя рытуальныя зборы. Зборы як праяўленне групавой прыналежнасці. Зборы як сродак стымулявання цікавасці да навакольнага свету. Зборы як сродак эмацыянальнага ўспрыяцця. Зборы Старажытнага свету і публіка. Перадмузейныя зборы ў эпоху сярэдневечча: зборы эканамічнага характару ў рэзідэнцыях феадалаў, калекцыі магічнага характару прадметаў у храмах, рэлікварыі.

**Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Адраджэння.** Гісторыка-культурныя передумовы станаўлення культуры Адраджэння. Уздым цікавасці да мінулага, гістарычнага вопыту чалавецтва. Павышэнне цікавасці да сістэматычнага калекцыяніравання аб'ектаў прыроды. Адраджэнне прыватнага збіральніцтва. Вучоныя-калекцыянеры і збіральнікі-арыстакраты. Узнікненне сацыяльных функцый музея. Стварэнне калекцыянерамі таксанамічных схем. Узнікненне першых музеяў. Галерэі, студыёла, гардароба, раратэкі, кунсткамеры, мюнц-кабінеты. Зараджэнне гістарычных, мастацкіх і прыродазнаўчых музеяў.

**Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы.** Першыя спробы групавання прадметаў музейнага значэння ў калекцыях і музеях. Фарміраванне ўяўленняў аб музейных экспанатах як базе для асветы і навуковых даследаванняў. Змены сацыяльных функцый збіральніцтва і сацыяльнага складу збіральнікаў. Універсальны характар прыватных збораў. Палацавыя калекцыі жывапісу, кунсткамеры, пінакатэкі, арсеналы, цэйхгаўзы, рэлікварыі, скарбніцы, мюнц-кабінеты. Узнікненне мастацкіх выставак. Музеі навуковых таварыстваў. Роля энцыклапедыстаў у развіцці музейнай справы. Новыя формы музейнай прэзентацыі (панарамы, паноптыкумы).

**Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы ў першай палове XIX ст.** Асноўныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары развіцця музеяў у першай палове XIX ст. Дэмакратызацыя публічных музеяў пад уплывам ідэй буржуазных рэвалюцый канца XVIII ст. Стварэнне нацыянальных музеяў. Узнікненне ваенна-гістарычных музеяў. Росквіт мастацтвазнаўства. Адкрыцце новых мастацкіх музеяў. “Залаты век” музеяў. Новыя формы папулярызацыі ведаў пра грамадства і прыроду. Узнікненне руху за ахову і рэстаўрацыю нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Геаграфічнае пашырэнне музейнай дзейнасці. Навуковыя экспедыцыі і стварэнне этнаграфічных музеяў і калекцый. Узрост нацыянальнай свядомасці ва ўскраінных дзяржавах Еўропы і яго ўплыў на адкрыццё музеяў.

**Пашырэнне музейнай сеткі і спецыялізацыя музеяў у другой пал. XIX – пачатку XX ст.** Павялічэнне колькасці спецыялізаваных музеяў: мастацкіх, прыродазнаўчых, навукова-тэхнічных, гістарычных. Тэхнічная рэвалюцыя. Стварэнне першых прамысловых музеяў. Лонданская сусветная выстаўка і яе роля ў развіцці музейнай справы. Фарміраванне спецыяльных гістарычных дысцыплін і ўзнікненне новых спецыялізаваных музеяў гістарычнага профілю. Навуковыя гістарычныя таварыствы і іх ўплыў на дзейнасць музеяў. Пачатак рэгіянальнага краязнаўчага руху і масавае ўзнікненне музеяў мясцовага краю. Іх сувязь з нацыянальнымі рухамі у шматнацыянальных імперскіх дзяржавах. Рост цікавасці да мясцовай гісторыі. Скансэны, мемарыялы, батальныя панарамы. Спецыялізацыя музейнай прафесіі.

**Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы паміж двумя сусветнымі войнамі.** Павялічэнне колькасці музейных устаноў розных профіляў у ліберальна-дэмакратычных краінах. Наладжванне міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках Лігі нацый. Пашырэнне музейнай літаратуры і перыядычных выданняў. Развіцце мастацкіх музеяў. Асаблівасці развіцця музеяў у фашысцкай Італіі і нацысцкай Германіі, ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы. Першыя законадаўчыя акты савецкага урада ў галіне музейнай справы. Нацыяналізацыя, улік, рэгістрацыя культурных і навуковых каштоўнасцей. Стварэнне дзяржаўных органаў кіравання музеямі. Усерасійская калегія па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва і даўніны. Стварэнне дзяржаўнага музейнага фонду, музейнай сеткі, музейных устаноў новых профіляў. Пралетарскія музеі, музеі-ансамблі, гісторыка-рэвалюцыйныя і мемарыяльныя музеі. Удзел грамадскасці ў музейным будаўніцтве.

**Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў другой пал. XX ст.** Асноўныя накірункі развіцця музейнай справы ў ліберальна-дэмакратычных краінах. Уплыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і павелічэння вольнага часу на рост значэння музеяў у агульнай культуры чалавецтва. Павелічэнне колькасці музеяў у свеце. Удзел міжнародных арганізацый у дзейнасці музеяў розных краін. Роля UNESCO ў ахове культурных каштоўнасцей, у культурным супрацоўніцтве. Стварэнне Міжнароднага савета музеяў, яго структура, мэты, рэгіянальныя арганізацыі. Міжнародны цэнтр па даследванню пытанняў аховы і аднаўлення культурных каштоунасцей (Рымскі цэнтр). Міжнародныя музейныя праекты. Асаблівасці фарміравання і развіцця музеялогіі як навуковай дысцыпліны, стварэнне сеткі музейных даследчых і вучэбных цэнтраў у свеце. Музейная педагогіка і сацыялогія. Рацыяналізацыя музейнай дзейнасці, узнікненне музейнага маркецінга і менеджмента. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій ва ўліковай і адукацыйна-асветніцкай дзейнасці. Музей і Інтэрнэт. Асноўныя накірункі развіцця музейнай справы ў сацыялістычных краінах. Пашырэнне музейнай сеткі. Стварэнне музеяў-запаведнікаў, цэнтралізаваных музейных сістэм, музейных аб’яднанняў.

**Характарыстыка сучаснага становішча музейнай справы Беларусі.** Музейная сетка, органы кіраўніцтва і музейнае заканадаўстваўства Рэспублікі

Беларусь. Характарыстыка асноўных накірункаў дзейнасці беларускіх музеяў. Палітыка рэгламентацыі і стандартызацыі дзейнасці музеяў. Роля і месца ваенна-патрыятычнай тэматыцы ў камплектаванні музейных калекцый і іх выкарыстанні ў адукацыйна-асветніцкіх мэтах. Філіялізацыя музейных установ. Музеі-запаведнікі. Буйнейшыя ведамасныя музеі. Грамадскія музеі. Умовы захавання, уліку, вывучэння і прэзентацыі музейных калекцый. Электронны каталог Дзяржаўнага музейнага фонда. Міжнароднае супрацоўніцтва беларускіх музеяў. Рэстытуцыя гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### Тэма 1.2. Тэорэтычная і прыкладная музеялогія

**Актуальныя пытанні сучаснай музеялогіі.** Шляхі павышэння ролі музеяў у сацыяльна-эканамічнам і духоўным развіцці грамадства. Тэндэнцыі развіцця сацыяльных функцый музеяў. Праблемы развіцця музейнай сеткі. Новыя сферы камплектавання музейных калекцый. Пераасэнсаванне крытэрыяў адбору помнікаў гісторыі і культуры ў музейныя зборы. Перспектывы выкарыстання ЭВМ ў розных галінах музейнай дзейнасці. Музеі і Інтэрнэт. Удасканальванне метадаў раскрыцця інфармацыйнага матэрыялу музейнага прадмета. Распрацоўка пытанняў музейнага крыніцазнаўства. Музейная экспазіцыя і сучасныя камунікацыйныя мадэлі. Музейны менеджмент і маркецінг. Псіхолага-педагагічныя праблемы навукова-асветніцкай работы музеяў. Распрацоўка пытанняў музейнай педагогікі. Новыя методыкі сацыялагічных даследаванняў у музеях. Навуковае забеспячэнне органаў кіравання музейнай справай.

**Агульная характарыстыка музея як сацыяльна-культурнага інстытута.** Паняцце аб музеі. Характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы. Сацыяльныя функцыі музеяў. Асноўныя мэты і задачы музеяў. Канцэпцыя і місія музея. Формы рэалізацыі музеямі сацыяльных функцый. Музей як камунікатыўная сістэма. Класіфікацыя музеяў. Профіль музеяў. Віды музейных установ. Грамадскія сувязі музеяў. Іх роля і значэнне для функцыяніравання музея як сацыяльна-культурнага інстытута. Музей і сродкі масавых камунікацый. Фактары развіцця музея. Арганізацыя і планіраванне навукова-даследчай работы ў музеях. Каардынацыя навуковай работы музеяў з іншымі навуковымі ўстановамі, ВНУ, архівамі.

**Камплектаванне, улік і захаванне музейных фондаў.** Музейная функцыя дакуменціравання і яе рэалізацыя ў працэсе фарміравання музейнага збору. Мэты і задачы камплектавання музейных фондаў. Аб’екты і крыніцы камплектавання. Дакументы камплектавання музейных калекцый (палявыя вопісы, дзённікі, акты прыёму, калекцыйныя вопісы) і асноўныя патрабаванні, якія прад’яўляюцца да іх. Улік музейных прадметаў як форма юрыдычнай аховы фондаў і ўмовы рэалізацыі ўсіх накірункаў дзейнасці музея. Асноўныя этапы ўліку фондаў. Задачы захавання музейных прадметаў. Паняцце аб сістэме захавання музейных фондаў і рэжым захавання музейных калекцый.

Фактары, якія ўплываюць на захаванасць помнікаў гісторыі і культуры. Паняцце аб музейнай калекцыі. Віды музейных калекцый. Значэнне музейнай калекцыі ў дзейнасці музея. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь: гісторыя, статус, структура, функцыі, арганізацыя.

**Сучасная музейная экспазіцыя – сінтэз навукі і мастацтва.** Галоўныя этапы развіцця экспазіцыйнай думкі. Мэты і задачы музейнай экспазіцыі. Музейная экспазіцыя і музейная камунікацыя. Музейная экспазіцыя як спецыфічная форма публікацый музейнага збору і вынікаў вывучэння музейных прадметаў. Найважнейшыя патрабаванні да экспазіцыі з пазіцыі навуковага зместу, архітэктурна-мастацкага вырашэння і псіхалагічных асаблівасцей успрымання наведвальнікаў. Агульная характарыстыка і спецыфічныя асаблівасці сістэматычнай, тэматычнай і ансаблевай экспазіцыі. Гісторыка-храналагічны, комплексна-тэматычны і праблемны прынцыпы пабудовы экспазіцыі, магчымасці іх выкарыстання ў экспазіцыйнай рабоце. Роля тэматыка-экспазіцыйнага комплекса ў структуры тэматычнай экспазіцыі.

**Музей у сістэме выхаваўчай работы.** Адукацыйна-выхаваўчая функцыя музеяў і яе рэалізацыя. Асноўныя этапы развіцця навукова-асветніцкай работы музеяў. Узаемасувязь навукова-асветніцкай работы музея з усімі напрамкамі яго дзейнасці. Вядучыя прынцыпы навукова-асветніцкай работы музеяў. Псіхалагічна-педагагічныя асновы выхаваўчага ўздзеяння музеяў. Паняцце аб музейнай педагогіцы. Задачы каардынацыі выхаваўчай работы музеяў з установамі культуры, асветы і іншымі музеямі. Адукацыйна-выхаваўчая работа музеяў і арганізацыя вольнага часу насельніцтва. Музеі і турызм. Пазамузейныя формы навукова-выхаваўчай работы. Формы і метады выхавання ў наведвальнікаў музейнай культуры. Музейная аўдыторыя як аб’ект музеялагічнага даследавання.

## РАЗДЗЕЛ 2. АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

### Тэма 2.1. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны на нацыянальным узроўні

**Паняцці “гісторыка-культурная спадчына”, “гісторыка-культурныя каштоўнасці” у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.** Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь. Паняцце гісторыка-культурнай спадчыны ў Кодэксе аб культуры. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей. Катэгорыі матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей.

**Характарыстыка археалагічнай спадчыны, прабемы яе захавання.** Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы аховы археалагічнай спадчыны. Азначэнне археалагічнай спадчыны. Археалагічныя аб’екты, археалагічныя артэфакты, помнікі археалогіі. Класіфікацыя археалагічнай спадчыны. Асаблівасці вывучэння археалагічнай спадчыны. Парадак абыходжання з выпадкова выяўленымі археалагічнымі артэфактамі.

**Характарыстыка дакументальнай гісторыка-культурнай спадчыны, праблемы яе захавання.** Азначэнне дакументальнай спадчыны,

яе віды. Прынцыпы забеспячэння захаванасці дакументальнай спадчыны. Праграма ЮНЕСКА “Памяць свету”.

**Характарыстыка архітэктурнай спадчыны, праблемы яе захавання.** Паняцце архітэктурнай спадчыны, яе віды. Асноўныя падыходы да захавання архітэктурнай спадчыны: археалагічная рэстаўрацыя і стылістычная рэстаўрацыыя. Віды работ на помніках архітэктурнай спадчыны. Азначэнне аўтэнтычнасці і яе складаючыя. Праблема рэканструкцыі архітэктурных помнікаў.

**Праблема захавання і выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей.** Паняцце захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей. Выкарыстанне і захаванне: пошук гармоніі. Абмежаванні на выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. Праблема захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Зоны аховы матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Праблема аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны.

**Азначэнне культурнай спадчыны ў міжнародным праве.** Паняцце культурнай спадчыны. Каштоўнасці, уласцівыя культурна спадчыны. Сэнс аховы культурнай спадчыны. Азначэнне культурнай спадчыны ў міжнародных канвенцыях.

**Паўнамоцтвы дзяржаўных органаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.** Паўнамоцтвы, склад і функцыі Беларускай навукова-метадычнай рады па пытанням гістоыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Кампетэнцыя і структура Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Паўнамоцтвы органаў архітэктуры і Дзяржбуднагляду.

**Змест паняцця “спадчына”. Класічнае і сучаснае разуменне спадчыны.** Спадчына ў кантэксце гістарычнай культуры. Аксіялогія культурных каштоўнасцей. Спадчына і аўтэнтычнасць. Індустрыя спадчыны і яе крытыка. Інтэрпрэтацыя розных відаў культурнай спадчыны.

## Тэма 2.2. Ахова культурнай спадчыны на міжнародным узроўні

**Абарона культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту.** Гаагская канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей ў выпадку ўзброенага канфлікту 1954 г. Першы пратакол да Канвенцыі 1954 г. і акупацыя. Дадатковыя пратаколы 1977 г. да Жэнеўскіх канвенцый. Сістэма аховы культурных каштоўнасцей згодна з Другім пратаколам да Канвенцыі 1954 г.

**Забарона і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці.** Гісторыя аховы рухомай культурнай спадчыны. Праблема вяртання культурнай спадчыны. Азначэнне культурных каштоўнасцей у Канвенцыі 1970 г. Рэжым увозу і вывазу культурных каштоўнасцей згодна з Канвенцыяй 1970 г. Іншыя механізмы міжнароднага

супрацоўніцтва ў справе спынення нелегальнага гандлю культурнымі каштоўнасцямі.

**Сістэма аховы спадчыны згодна з Міжнароднай канвенцыяй аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны 1972 г.** Гісторыя прыняцця і рэалізацыі Канвенцыі 1972 г. Асноўныя палажэнні Канвенцыі 1972 г. Вызначэнне выбітнай універсальнай каштоўнасці. Рэжым аховы і менеджменту. Ахова сусветнай спадчыны на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Характарыстыка Спісу сусветнай спадчыны. Міжнародная дапамога. Адміністрацыйная структура.

**Асаблівасці аховы падводнай культурнай спадчыны.** Сфера дзеяння Канвенцыі 2001 г. Прымальныя археалагічныя метады. Праблема юрысдыкцыі. Рэжым правапрымянення. Міжнароднае супрацоўніцтва.

**Азначэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны і прабема яе захавання.** Азначэнне нематэрыяльнай спадчыны і аховы ў Канвенцыі 2003 г. Кіруючыя органы і Фонд Канвенцыі 2003 г. Абавязкі джяржаў-удзельніц Канвенцыі. Карысць ад рэалізацыі Канвенцыі 2003 г. Працэдура падачы заявак ў Спісы Канвенцыі 2003 г. і Рэестр перадавых практык па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

**Праблема захавання і інтэрпрэтацыі савецкай культурнай спадчыны.** Перасэнсаванне гісторыі другой паловы XX ст. у розных краінах Усходняй Еўропы. Музеефікацыя спадчыны савецкага перыяду. Асаблівасці захавання савецкай культурнай спадчыны ў Беларусі

**ЮНЕСКА як вядучая міжнародная арганізацыя ў галіне аховы культурнай спадчыны.** Міжнароднае канвенцыянальнае права. “Мягкае” права. Мандат ЮНЕСКА. Узаемаадносіны паміж ЮНЕСКА і канвенцыямі ЮНЕСКА ў галіне культурнай спадчыны.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура:

1. Ананьев, В. Г. История зарубежной музеологии: учеб.-метод. пособие / В. Г. Ананьев. – СПб.: СПбГУ, 2014. – 136 с.

2. Грицкевич В.П., Гужаловский А.А. История музеев мира: Учеб. пособие для студентов ист. фак. / В.П. Грицкевич, А.А. Гужаловский. – Мн.: БГУ, 2003. – 284 с.

3. Гужалоўскі А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі. Вуч.-метад. Дапаможнік. Мінск: БДУ, 2012. – 303 с.

4. Культурно-историческое и природное наследие Беларуси: теория и практика использования в туризме / Л.М.Гайдукевич и др. – Минск: Четыре четверти, 2014. – 348 с.

5. Мартыненко, И.Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь: учебное пособие / И.Э. Мартыненко. – Гродно: Гродненский государственный университет, 2017. – 561 с.

6. Михайлец, М.А. Охрана культурного наследия на международном уровне: пособие / М.А. Михайлец. – Минск: БГУ, 2017. – 231 с.

7. Основы музееведения: учебное пособие для студентов высших учебных заведений, обучающихся по специальности 052800 “Музейное дело и охрана памятников”. Отв. ред. Э. А. Шулепова. – М.: ЛИБРОКОМ, 2015. – 430 с

8. Хухлындина, Л.М., Гайдукевич, Л.М. Туризм и культурное наследие: пособие / Л.М. Хухлындина, Л.М. Гайдукевич. – Минск: БГУ, 2014. – 296 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/111504. – Дата доступа: 10.03.2018.

### Дадатковая літаратура:

9. Юренева Т.Ю. Музееведение : Учебник для высшей школы. 4-е изд., испр. и доп. – М.: Академический Проспект, 2007. – 560 с.

10. Государственная программа развития туризма Республики Беларусь на 2016-2020 годы. – Мн.: М-во спорта и туризма Респ. Беларусь, 2015. – 9 с.

11. Закон Республики Беларусь «О туризме» с исправлениями и дополнениями. – Мн., 2015 – 47 с.

12. Косых, В. И. Музееведение: учебное пособие / В. І. Косых, О. А. Яремчук. – Чита: Забайкальский гос. ун-т, 2017. – 140 с.

13. Музеи Беларуси [Изоматериал] = Музеі Беларусі = Museums of Belarus : [фотоальбом / редакционный совет: В. В. Андриевич (главный редактор) и др.; фото: А. П. Дрибас, С. М. Слепцов]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 446 с.

14. Основы музееведения: Учебное пособие / Отв. ред. Э.А. Шулепова. – М.: Едиториал УРСС, 2005. – 504 с.

15. Сиволап, Т. Е. Музееведение: учебное пособие / Т. Е. Сиволап. – СПб.: СПбГИКиТ, 2018. – 285.

16. Философия музея: учеб. пособие / под ред. М. Б. Пиотровского. – М.: ИНФРА-М, 2014. – 192 с.

17. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [ Электронный ресурс] : 20 июля 2016 года № 413-З. – национальный правовой Интернет-портал республики Беларусь. – Режим доступа : http://pravo.by . – Дата доступа : 15.09.2018 г.

18. Богуславский М.М. Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты. 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Норма, Инфра, 2012. – 416 с.

19. Жывая спадчына Беларусі: Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі / укладальнік Мармыш Т.М. – Мінск : Інбелкульт, 2014. – 163 с.

20. Имплементация Конвенции ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия на национальном уровне: руководство для тренинга. – Минск, 2012.

21. Исследование о соответствии национального законодательства Республики Беларусь нормам международного гуманитарного права по вопросу о защите культурных ценностей в период вооружённых конфликтов / Л.В. Павлова, Е.Ф. Довгань. – Минск, 2009.

22. Кисель, В.П. Памятники всемирного наследия / В.П. Кисель. – Минск : Беларусь, 2010. – 382 с.

23. Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по охране культурного наследия: сборник / сост. В.В. Глинник. – Минск, 2000.